ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ

ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА І МЕНСКАГА КОМІТЭТАЎ ЛЕНІНСКАГА КОМУНІСТЫЧНАГА САЮЗУ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ

№ 63 (445) Серада 8 чэрвеня 1927 г. | Выходзіць тры разы на тыдню у СЕРАДУ, ПЯТНІЦУ І НЯДЗЕЛЮ | Год выд. VII. | Рэдактар прымае ад 12 да 2 гадз. дню. Сакратар ад 10—12 і ад 2—3 гадз. Тэл. № 903. | Адрас рэдакцыі газэты „Чырвон. Зьмена“: Менск, Комсам. 25.

Патрэбен пералом!

Газэты заклікаы зараз адыгрываць вялізную ролю ў штодзённай працы комсамолу.

Цэнтральная газэта комсамолу Беларусі — «Чырвоная Зьмена» за апошні час мае шэраг значных дасягненьняў.

Гэта адзначана спэцыяльнымі рашэньнямі, як ЦК ЛКСМБ, так і ЦК УсеЛКСМ. Але ня гледзячы на значнае палепшаньне зьместу—распаўсюджваньне газэты пастаўлена надта кепска.

Распаўсюджваньне «Чырвон. Зьмены» знаходзіцца на задвор'ях увагі, як ячэек, так і акругкомаў.

Між тым газэта «Чырвоная Зьмена» ў агульнай сыстэме кіраўніцтва саюзнай працай пачынае займаць значнае мейсца і слабасьць распаўсюджваньня гэтай газэты ёсьць разам з тым аслабленьне, падрыў саюзнага кіраўніцтва.

Цэнтральны Камітэт Комсамолу Беларусі, на сваім пленуме, пастанавіў прыдаць працы па павялічэньню тыражу «Чырвонай Зьмены» характар аднэй з важных палітычных кампаній.

ЦК пры ацэнцы працы тэй ці іншай організацыі будзе асабліва сур'ёзную ўвагу зьвяртаць на тое, якая колькасьць падпішчыкаў на газэту прыходзіцца на тую ці іншую акругу ці раён.

Няўважлівыя адносіны да распаўсюджваньня газэты павінны быць у корні зьменены. Цэнтральны Камітэт заклікае акругкомы і райкомы, заклікае ўсю комсамольскую організацыю Беларусі да неадкладнага, рашуючага пераломy ў адносінах да распаўсюджваньня «Чырвонай Зьмены».

Посьпехі «Чырвонай Зьмены», павялічэньне яе тыражу зьяўляюцца посьпехамі ўсяго комсамолу, узмацненьнем яго выхаваўчай працы.

Многае залежыць ад комсамольскага актыву, ад яго прыкладнасьці ў адносінах да распаўсюджваньня газэты.

Тып актывістага «ўсезнайкі», актывіста, які плюе «на ўсіх і на ўсё», у тэй лічбе і на распаўсюджваньне газэты—павінен бязьлітасна кляймiцца комсамольскай організацыяй.

Актыў павінен зьявіцца галоўным атрадам барацьбы за падпіску, за чытачоў «Чырвонай Зьмены».

З 15-га чэрвеня па 22-ае ліпеня па Беларусі будзе праводзіцца пяцітыднёвік газэты «Чырвоная Зьмена».

Комсамольская організацыя Беларусі, выхаванцам якой зьяўляецца «Чырвоная Зьмена», павінна на справе, тыражом паказаць, што «Чырвоная Зьмена» зьяўляецца неадлучнай часткай усяе комсамоліі.

Мы адзначаем, што БАБРУЙСКАЯ і АРШАНСКАЯ організацыі прынялі першыя практычныя меры дзеля павялічэньня колькасьці падпішчыкаў.

Трэба падраўняцца і астатнім акруговым організацыям.

Перапом павінен быць зроблен.

Газэта павінна павялічыць тыраж.

Усім акругкомам, райкомам і ячэйкам ЛКСМБ

Комсамольскі друк у сучасны момант займае значнае месца ў агульнай сыстэме саюзнага кіраўніцтва.

Комсамольскі друк абагульняючы штодзённы вопыт Саюзнай працы, зьяўляецца застрэльшчыкам шэрагу мерапрыемстваў, організатарам творчай думкі Саюзу і выхавацелем шырокіх мас ня толькі комсамольцаў, але і беспартыйнай рабоча-сялянскай моладзі.

Цэнтральны Кам тэт УсеЛКСМ, у сваім водгуку аб газэце «Чырвоная Зьмена» дае наступную ацэнку газэце, як аднаму з рычагоў саюзнага кіраніцтва,--адзначаючы:

„...узмацненьне ролі газэты «Чырвоная Зьмена» у сыстэме ўсёй «комсамольскай працы і грамадзкага жыцьця рэспублікі».

«... узмацненьне масавага характару газэты».

«.. разгарненьне організацыйна-масавай працы: экскурсіі, масавыя наведваньні тэатраў, скліканьне нарад па асобных пытаньнях комсамольскай працы (кваліфікаваныя работніцы, замужныя комсамолкі, бацькі комсамольцаў, політсуды і г. д.)».

«... увязка падаваемага газэтай кіраўнічага і масавага матэр'ялу па асобных пытаньнях, а таксама жывасьць і вастрата ў падачы і абгаварваньні высоўваемых газэтай пытаньняў».

Гэтыя вытрымкі з аўтарытэтнага водгуку ЦК УсеЛКСМ перакананей за ўсё кажуць аб тым, што газэта «Чырвоная Зьмена» умела выконвае пастаўленыя перад ёю задачы, што яна зьяўляецца моцным памочнікам ЦК ЛКСМБ у яго штодзённай працы.

Побач з дасягненьнямі, якія па славох рэзолюцыі характарызуюць становішча газэты, як упаўне здавальняючым, адзначаны таксама недахопы (слабая праца з юнкорамі, няўдалая пабудова некаторых пытаньняў і г. д.).

Выжыцьцё гэтых недахопаў газэты павінна, таксама, зьявіцца колектыўнай справай усёй комсамольскай організацыі.

Уплыў газэты, яе роля, аднак, азначаюцца ня толькі зьместам, але і тым, наколькі шырока газэта распаусюджваецца ў масах працоўнай моладзі. Між іншым гэты вучастак—найбольш слабы.

Увага комсамольскай організацыі да распаўсюджваньня газэты значна паслабла.

Калі Віцебская акруга ў маі 1926 г. дала 1079 падпішчыкаў, дык к маю 1927 году—за год - колькасьць падпішчыкаў зьменшылася амаль у 4 разы—286, у Аршанскай акрузе падпішчыкаў зьменшылася амаль у 5 разоў, у Слуцкай акрузе—у 4 разы і г. д.

У комсамольскай організацыі Беларусі павінен быць зроблены каранны перапом у адносінах распаўсюджваньня газэты.

З 15-га чэрвеня па 22 ліпеня абвяшчаецца 5-ці тыднёвік газэты «Чырвоная Зьмена».

Цэнтральны Камітэт, у сувязі з 5-цітыднёвікам газэты «Чырвоная Зьмена» прапануе ажыцьцёвіць наступнае:

1. На чарговым саюзным дні ўсіх, без выключэньня, ячэек ЛКСМБ паставіць першым пытаньнем—даклад аб распаўсюджваньні газэты «Чырвоная Зьмена».

2. Перад чарговым саюзным днём (на якім будзе пастаўлен даклад аб «Чырвонай Зьмене»)—правесьці па раёнах нарады актыву, паставіўшы на абвестцы дню пытаньне аб распаўсюджваньні «Чырвонай Зьмены». Іншымі пытаньнямі раіцца абвестку дню не загружаць.

3. Зрабіць на сходах комсамольскіх ячэек выбары ўпаўнаважанага па друку. Пажадана, каб упаўнаважаны па друку зьяўляўся адным з сяброў бюро ячэйкі.

4. Правядзеньне ў гарадох і раёнах конфэрэнцыі чытачоў газэты «Чырвоная Зьмена».

5. Скліканьне спэцыяльных нарад юнкораў, прысьвечаных разбору газэты «Чырвоная Зьмена»

6. Організацыю нарад апоргаў і ўпаўнаважаных па друку з пастаноўкай пытаньня аб газэце і практычных захадах па распаўсюджваньню яе.

7. Ва ўсіх насьценных газэтах у часе пяцітыднёвіку павінен зьмяшчацца спэцыяльны аддзел для популярызацыі распаўсюджваньня газэты.

8. Самым шырокім чынам выкарыстаць юнсэкцыі клюбаў і правесьці раённыя і акруговыя конкурсы па распаўсюджваньню газэты.

Распаўсюджваньне «Чырвонай Зьмены» не кампанія некалькіх дзён, а сталая задача ўсіх ячеек і комсамольцаў.

Кампанія, прысьвечаная «Чырвонай Зьмене», павінна праводзіцца самым шырокім чынам. Асноўная мэта: стварэньне каранного пераломy ва ўсёй організацыі ў адносінах распаўсюджваньня газэты.

Пасьля пяцітыднёвіка на бюро ЦК будуць пастаўлены спэцыяльныя даклады асобных акругкомаў аб практычных выніках па ўзмацненьню падпіскі на газэту.

Цэнтральны Камітэт асабліва падкрэсьлівае, што працы па распаўсюджваньню «Чырвонай Зьмены» надаецца ня толькі практычны, але і вялікі палітычны характар.

Гэты ліст прапануецца прачытаць на агульных сходах комсамольскіх ячэек.

Сакратар ЦК ЛКСМБ

А. Бараньнікаў.



Доўгія залежваньні тавараў ці „рацыянальнае“ скарыстоўваньне капіталу. Што важней: свая асоба ці спажывец.

Чаму ляжаць тавары?

Яшчэ ў кастрычніку 1926 году Беларускае Інваліднае Коопэратыўнае Таварыства парашыла спыніць дробны гандаль.

Праўленьне БІКА энэргічна ўзялася за правядзеньне гэтага рашэньня. Паляцелі загады, адносіны, засядалі розныя камісіі, абгаварвалі і, урэшце, крама № 1 па Ленінскай вуліцы зьліквідавана.

Але бюрократ тым і адрозьніваецца, што ён калі і пачне рабіць добрую справу, дык ніколі не давядзе яе да канца.

Здавалася-б, што пасьля зьліквідаваньня крамы, тавар павінен быў-бы быць рэалізаван.

Але ня так яно было. Краму зьліквідавалі, а тавар, які знаходзіўся там, застаўся сабе ляжаць.

Ляжаў да таго часу, покуль не пачаў псавацца.

Дзьве швейныя нажныя машыны ўжо папалі ржавець, тады, калі іх можна было-б скарыстаць хаця-бы для майстэрнаў БІКА, якія ў гэты-ж час куплялі такія-ж самыя машыны ў другіх організацыях.

У гэтай-жа краме «адпачываюць» таксама іншыя тавары, як карыца, мука, разынкі, крупа, італьянскія бабы.

Гэтая крама не адзіная. У БІКА ёсьць і другія склады, на якіх таксама тавары чакаюць «невядома чаго», як картон на 6000 рублёў, шаўрэт на 1000 руб. і г. д.

Ці доўга яшчэ будуць ляжаць гэтыя тавары на складах БІКА?

Трэба думаць, што РСІ вывядзе з непрабуднага сна працаўнікоў Інваліднага Таварыства, а сумесна з імі і тавары знойдуць сабе адпачынак у другім месцы.

Пасьля 7-мі гадзін, хоць зубы на паліцу

Субота вечарам... Пасьля 7 гадзін усе магазыны МЦРК зачынены.

Ходзіш сабе па гораду, каб купіць што паесьці, ня ўсякі-ж можа днем закупіць ўсё што трэба. Дык не.

Супрацоўнікам МЦРК трэба вечарам адпачыць, а спажывец зможа прыйсьці ў другі раз.

«Безобразие», «гэта бюрократычныя адносіны да спажыўца» і інш., вось словы, якія можна пачуць у гэты час каля магазынаў МЦРК.

Асабліва такія ненармальнасьці назіраюцца ў акраінных коопэратывах, дзе супрацоўнікі крамы думаючы, што ўсё роўна ніхто ня будзе ведаць, зачыняюць магазыны на многа раней вызначанага часу і адчыняюць таксама з вялікімі спазьненьнямі.

Адзінадумцы БІКА.

Калісьці мы пісалі, што ў праўленьні Менскага ЦРК існуюць вялікія выдаткі на камандыроўкі.

Пазьней з ЦРК паведамлялі, што выдаткі на камандыровачныя яны скарацілі.

Менш цяпер трацяць. Але як трацяць,--ці рацыянальна?

Паўтара месяцы таму назад праўленьнем МЦРК быў камандыраван чалавек за пакупкай пасуды.

Раз пасылаюць чалавека, дык трэба думаць, што ў Менску адчуваецца патрэба на пасуду?.. Нічога падобнага.

Вось ужо паўтары месяцы як 10 яшчыкаў эмаліраванай і іншай пасуды склалі на складзе МЦРК па Комсамольскай вуліцы.

Пасуда ляжыць, ламаецца... Хутка з яе нічога не застанецца, а некаторыя думныя галовы ў праўленьні МЦРК сядзяць і ніякай ўвагі на яе не зьвяртаюць.

У абцугох.



Гэтая карыкатура бязумоўна малюе тое, што ў недалёкай будучыне стане «кітайскаю сапраўднасьцю».

Дарога на Пекін адкрыта.

Увесь мінулы тыдзень быў трыўмфіяльным маршам рэволюцыйнай арміі супроць паўночных гэнералаў. Кожны дзень прыносіць новыя перамогі Ўханскаму ўраду і новыя новыя паражэньні Чжанцзалінаўскай клікі.

Гэта прымушана прызнаць нават ангельскае агэнцтва «Рэйтэра». Гэта са скрыгатам зубоў прызнаюць і паўночныя мілітарысты. З узяцьцем Кайфіну, з прычыны хуткага адступленьня мукдэнцаў, адчыняецца ўжо дарога і на самы Пекін. Развал мукдэнскай арміі і дэморалізацыя ў яе шэрагах настолькі вяліка, што Чжан-Цзо-Лін ужо і ня думае ўтрымацца дзе небудзь да Цянь-Цзіна. Сюды цяпер адступаюць яго разьбітыя арміі і тут яны паспрабуюць даць бой да Пекіна. Але тут ён ужо ня столькі спадзяецца на свае сілы, колькі на сілы імпэрыялістых, якія сьцягваюць сюды свае войскі.

Такім чынам Англія і іншыя за ёй ідучыя імпэрыялістыя спрабуюць перанесьці інтэрвэнцыю з Поўдня на Поўнач.

Дзень 30 мая, гадавіна шанхайскіх растрэлаў, вылілася ў магутную антыангельскую дэмонстрацыю шанхайскіх рабочых. І гэта, ня гледзячы на тое, што чанкайшыцкая ўлада прымала ўсе захады, каб перашкодзіць гэтай дэмонстрацыі.

Сілы рэволюцыі мацнеюць з кожным днём. «Чырвоныя пікі» працуюць ва ўсім тылу мукдэнцаў, зьнішчаючы іх войскі і адбіраючы ў іх зброю. Калі ў справу ўмяшаюцца і імпэрыялістыя, яны будуць мець супроць сябе ня толькі рэволюцыйныя арміі, але і ўвесь паўстаўшы чатырохсотмільённы кітайскі народ.



Судзьдзя.

Таварыш кінуў вёслы і закурыў папяроу. Лодка ціха шла па цёплай, вячэрняй вадзе. Месяца ня было, зорак таксама, берагі растварыліся ў цемры і згубілі абрысы, і здавалася, што наша вузенькая Сьвіслач стала раптам шырокай і бязьмежнай... Мой таварыш—комсамольскі работнік акруговага маштабу, прыехаўшы на некалькі дзён у Менск—знаходзіўся пад уражаньнем дзіўнага вечару, марна глядзеў на неба і гаварыў бяз умолку:

— Ты скардзішся на тыраж... Кажаш, што акругі вінаваты, што падпіска на „Чырвоную Зьмену“ слаба ідзе... Чудак чалавек!.. Ты скажы, калі ласка, каму яна патрэбна твая „Зьмена“? Што ў ёй чытаць? Не разумею!...

Ён зацягнуўся і працягваў:

— Падпіска... лёгка сказаць—падпіска.. А на што падпісацца? Эх, калісьці „Зьмена“ была сапраўды газэтай, а цяпер...

— Сапраўды—„Зьмена“ дрэнная газэта—цьвёрда сказаў я.—І няма чаго ў ёй чытаць!.. Ты праў!

— Вось бачыш—падхапіў таварыш—і ты прызнаеш! Ды як-жа ня прызнаць? Факт!

— Так, так—працягваў я—сьпіць „Чырвоная Зьмена“, моцна сьпіць. А сапраўдная комсамольская газэта магла-б праводзіць вялізную работу!

— Ого!—сказаў таварыш—яшчэ якую!..

— Вось, напрыклад, чаму-б „Чырвонай Зьмене“ не організаваць усебеларускую экскурсію моладзі па маршруту Ленінград—Волхаўбуд—Кранштат? Гэта-ж было-б найлепшай пропагандай пролетарскага турызму! Вось ідэя, а?

— Так—згадзіўся таварыш—гэта была-б выдатная справа! Але куды там „Чырвонай Зьмене“! Яна да гэтага не дадумаецца!

— Ці, напрыклад, організаваць масавы паход рабочай моладзі ў тэатр... у наш Беларускі Дзяржаўны Тэатр, а? І потым правесьці грандыёзны дыспут аб пастаноўках, выявіць думку шырокіх колаў моладзі—гэта-ж было-б так добра, так цікава! Як ты думаеш?

— Што я думаю? Г... было-б на яць, але што толку—усё ...на „Зьмена“ гэта ніколі не правядзе. ...а ня здольна і...

Але я не даваў яму гаварыць, я закідваў яго бясконца проэктамі тых работ, якія магла-б праводзіць наша газэта... Я гаварыў аб кампаніі па зьніжэньню цэн, аб барацьбе з бюрократызмам, аб масавым шахматным турніры працоўнай моладзі, аб сельска-гаспадарчых конфэрэнцыях, аб нарадах па розных пытаньнях комсамольскай працы, аб рэгулярнай літстаронцы, аб сходзе бацькоў комсамольцаў, аб усебеларускім абмене вопытам, аб...

Таварыш нязьменна знаходзіў мае проэкты надзвычайна добрымі. У канцы, калі я ўжо змарыўся, ён сказаў:

— Ну, калі-б усё гэта „Чырвоная Зьмена“ змагла-б ператварыць у жыцьцё—яна была-б на вышыні!

— О, бязумоўна на вышыні.

І тады я задаў яму толькі адно маленькае пытаньне:

— Скажы, а ты „Чырвоную Зьмену“ чытаеш?

— А што—пачуўся няцьвёрды адказ—ты гэта чаго?..

— Чытаеш?

Напэўна мае вочы даволі грозна бліснулі ў цемры. Таварыш закашляўся і ўзяўся за вёслы.

— Чытаеш???

— Да ты чаго прыстаў?.. Эх, зьвяжыся з гэтымі газэтчыкамі!..

Я ня вытрымаў і зарагатаў:

— Ты-ж газэту ў руках ня трымаў, а бярэшся судзіць! Уцямі: я цябе ня проэкты расказваў, а праўду, штодзённую праўду нашай газэты!

Таварыш маўчаў.

І я зразумеў яго.

Міх. Гольдбэрг.

СОТНІ ВЁРСТ—НЯ Ў ЛІК.

Раўняйцеся па Бабруйчанам!

ЯНЫ ДОБРА ОРГАНІЗОЎВАЮЦЬ ТУРЫСЦКІ РУХ

ВОДГУКІ ЭКСКУРСЫІ „ЧЫРВОНАЗЬМЕНЦАЎ“

Накінуліся на вёрсты.



З кожным днём узрастае рух турыстых. Організоўваюцца пры ячэйках групы. Шэраг лістоў, заяў у раённыя і акруговыя камітэты аб аказаньні дапамогі сьведчыць аб тым, што трэба ў гэтую працу ўнесьці большую організаванасьць. Акруговыя бюро турыстых павінны разгарнуць вялікую працу ў справе кіраўніцтва рухам.

Толькі наступіла вясна, як ужо асобныя групы пачалі рыхтавацца да паездак; цяпер гэта ўжо не асобныя выпадкі, а нешта масавае.

Першая група Бабруйскіх комсамольцаў **з лесазаводаў**, 22-га мая выехала на лодцы па маршруту Беразіна—Екатэрынаслаў—Севастопаль—Ялта. На свае сродкі яны пабудавалі лодку «Юны турыст», запасьліся ўсім патрэбным, атрымалі кантрольныя карткі, на якіх адпаведныя бюро ў тым, ці іншым горадзе будуць адзначаць час прыбыцьця і акажуць дапамогу ў справе азнаямленьня з мясцовасьцю, працай і інш.

Другая група комсамольцаў (чалавек 40-42) выяжджае 5-7 чэрвеня г. г. па такому-ж маршруту з Жлобіну, таксама на свае сродкі.

Гэта дальні від турызму. Пачынае разьвівацца і больш блізкі. 5 чал. **з ячэек харчаўнікоў** на 3-4 дні на лодцы накіроўваюцца ўверх па Беразіне да Сьвіслачы (65 вёрст).

Комсамольская ячэйка **шклянога заводу «Акцябрь»** вядзе падрыхтоўчую працу да організацыі экскурсіі на шкляныя заводы ў горад Барысаў, скарыстаўшы час водпуску. Думаюць організаваць васкрэсьнікі, паставіць спэктаклі.

На днях бюро юных піонэраў Старадароскага раёну, Слуцкай акругі напісала заяву ў Бабруйскі Акругком, каб дапамаглі ім у організацыі экскурсыі, ў якой прымуць удзел сто піонэраў. Бязумоўна, што ім будзе аказана ўсякая дапамога і экскурсія будзе наладжана.

Бабруйскі акруговы камітэт комсамолу рашыў організаваць 19-га чэрвеня акруговы зьлет вэлёсыпэдыстых (комсамольцаў і беспартыйных).

Затым прабег па маршруту Бабруйск—Слуцк—Менск—Бабруйск (500 вёрст). Грунтоўныя мэты гэтага мерапрыемства акрамя аб'яднаньня вэлёсыпэдыстых і разьвіцьця вэлёспорта—вывучэньне характэрных мясцовасьцяй, права, быту рабочых і сялян і рацыянальнае скарыстаньне атрыманага водпуску. На раёнах праводзіцца належная падрыхтоўчая праца.

Вэлёсіпэдыстых па акрузе маецца каля 70 чал. З іх найлепшыя будуць вызначаны для прабега. Думаем, што Слуцкі і Менскі акругкомы акажуць усё магчымае ў дапамозе нашым турыстам.

Я. Ізакаў.

Весткі з дарогі.

Пад узмахі вёслаў.

5 дзён, як мы ў дарозе.

За гэтыя 5 дзён мы дасягнулі Лоева; па дарозе нам дзьмуў папутны вецер і мы ішлі нейкі час пад парусам і аднойчы за 6 гадзін зрабілі 75 вёрст, у другія дні шлі на вёслах і калі-не-калі пад парусам.

Пагода ўвесь час была добрая, сонечная, нават ехалі ў адных трусіках, але сягоньня рэзкая перамена, падзьмуў халодны вецер і ідзе дождж, што прымусіла нас прастаяць на берагу 9 гадзін, якія аднялі ад нас 40-50 вёрст. Да нядзелі думаем быць у Кіеве, дзе прабудзем дні тры. На Дняпро вышлі ў аўторак у $7^1/_2$ гадзін раніцы. Рака шырэй у параўнаньні з Беразіною ў разы тры, маюцца віры, пры ветры ўздымаюцца вялізныя хвалі, якія дасягаюць мэтра, але мы жарым ва ўсю, ня гледзячы ні на што.

У Рэчыцы прабылі 6 гадзін, азнаёміліся са становішчам камсамольскай організацыі і фізгурткоў. З боку акруговага савету фізкультуры спатканьне было добрае, паказалі нам свой спортклюб. Памяшканьне няважнае, але абарудавана куды лепш, чым наша,—маецца фізгабінэт з усякімі прыборамі. Устанаўліваецца водная станцыя, маюцца лодкі для гонак. Справа з праездам пад мастамі абстаіць добра.

«Шамоўкі» хопіць да Кіева, а там купім. Работа на вёслах прыемна адбіваецца на апэтыту і самаадчуваньні турыстых, ловім рыбу, варым «уху», наогул жывем добра, і паміраць ня трэба, захопліваемся прыродай на 100 процантаў. Лес зьвініць ад салаўіных трэльляў.

Плывем і плывем далей.

Група бабруйскіх турыстых.

26 мая каля кастра ўблізку в. Бельне, у адлегласьці 40 вёрст ад Лоева.



Дзе сьпяць?

Пашырым распаўсюджваньне „Чырвонай Зьмены“.

Малайцы аршанцы!

Чакаем практычных вынікаў

На пасяджэньні бюро Аршанскага **Акругкому комсамолу** была заслухана інформацыя сакратара Акругкому тав. **Варончанкі** аб пашырэньні падпіскі на газэту «Чырвоная Зьмена».

Тав. Варончанка ўказаў, што падпіска на «Чырвоную Зьмену» у акрузе не здавальняюча і што такое становішча ў далейшым павінна быць зьнішчана.

Па інформацыі тав. Варончанкі бюро прыняла наступную рэзолюцыю:

1. У мэтах пашырэньня дапіскі на «Чырв. Зьмену», лічыць неабходным правесьці шырокую кампанію перавыбараў яч. упаўнаважаных на сходах яч., на працягу з 1 па 30 чэрвеня.

Грунтоўнымі момантамі ў гэту кампанію высунуць наступныя:

а) падбор лепшых т. т., больш працаздольных і аўтарытэтных, на працу ў якасьці яч. упаўнаважаных па друку;

б) шырокае азнаямленьне комсамольцаў і беспарт. рабоча-сялянск. моладзі з правадзімай працай газ. «Чырв. Зьмена»;

г) пашырэньне падпіскі на газэту «Ч. З.».

2. Абавязаць кожнага актывістага (Райпрацаўнікоў і Сакратароў яч., сельсаветч. коопэратараў і інш.), абавязкова выпісаць «Ч. З.», разам з гэтым праводзіць працу па выпісцы комсамольцамі газэты «Ч. З.».

3. Бюро АК выкідвае лёзунг «кожны комсам. павінен сам выпісваць і завербаваць аднаго дапісчыка з беспартыйнай моладзі на газэту «Ч. З.».

4. Райдзетбюро і яч. правесьці належную працу па колектыўнай выпісцы піонэрамі газ. «Ч. З.».

5. Усім працаўнікам АК у часе выезду на раёны праверыць ступень выконваемасьці гэтых дырэктыў.

6. Адабраючы мерапрыемствы, зробленыя на Аршанскай Райконфэрэнцыі, лічыць неабходным на астатніх Райконфэрэнцыях паставіць інформацыі аб «Чырвонай Зьмене», праводзячы на гэтых конфэрэнцыях масавую падпіску.

7. Пасьля месячнага тэрміну заслухаць даклады двух Райкомаў КСМ аб распаўсюджваньні газэты і дапіскі.

8. Пацьвердзіць ранейшую дырэктыву нарады сакратароў і бюро АК аб высьвятленьні вопыту Акруговай організацыі на старонках «Чырвонай Зьмены».

9. Прасіць рэдакцыю «Чырвонай Зьмены» наладзіць акуратную дасылку і аб зьмяншэньні асобных артыкулаў.

Ня менш, як 250!

(М. Асіпавічы, Бабруйшчына)

Асіпавіцкая райконфэрэнцыя комсамолу заслухала інформацыю аб становішчы «Чырвонай Зьмены» і прызнала, што ня гледзячы **на значнае паляпшэньне «Чырвонай Зьмены»** з усіх бакоў—організацыя амаль што нічога не рабіла па распаўсюджваньню і популярызацыі яе сярод комсамольцаў і беспартыйнай рабоча-сялянскай моладзі, у выніку чаго колькасьць падпішчыкаў у раёне не расла, а падала з кожным месяцам.

Конфэрэнцыя адзначыла, што такое становішча зьяўляецца ненормальным і прапанавалі організацыі правесьці шырокую месячную кампанію для популярызацыі распаўсюджваньня «Чырвонай Зьмены». Райкому даць заданьні ячэйкам па распаўсюджваньню «Чырвонай Зьмены» з такім разьлікам, **каб кожны месяц было ня менш 250 падпішчыкаў у раёне.**

Дэлегаты конфэрэнцыі ашаламіліся тым, што так запамяталі аб сваёй комсамольскай газэце. Яны ўсе абяцалі прыняць самы актыўны ўдзел у выкананьні пастановы конфэрэнцыі.

С. Яндульскі.

Ганьба!

На „чырвоную“ дошку.

(Менск).

Прышлося пабываць мне ў шмат якіх комсамольскіх ячэйках і вось што я там убачыў.

Комсамольская ячэйка пры шкляной гуце «Пролетары» налічвае каля **400 комсамольцаў. Выпісваюць «Чырвоную Зьмену» усяго тры чалавекі. Сакратар і бюро ячэйкі газэты на выпісваюць.** Упаўнаважаны па друку не вядзе ніякай працы па распаўсюджваньню газэты. Ды дзе яму агітаваць за газэту, калі ён яе **і сам ня выпісвае.**

Ячэйка Цэнтральнага Інстытуту працы. На ўсю ячэйку **(50 чалавек) «Чырвоную Зьмену» выпісваюць двое.**

Ячэйка працколектыў пекароў «Чырвонай Зьмены» (ня гледзячы на тое, што комсамольцаў налічвае **30 чалавек) ня выпісвае ніводнага экземпляру.**

У ячэйцы **працаўнікоў мастацтва** ўпаўнаважаны па друку тав. Ярашэвіч старанна ўзяўся за справу выпіскі газэты. Папершае, выпісаў сам, а на першым сходзе абвесьціў, што, хто хоча выпісаць **«Чырвоную Зьмену»** хай прынясе грошы на другі сход. Але гэты другі сход адбыўся тады, калі позна было ўжо выпісаць на чэрвень месяц газэту. У выніку на ўсю ячэйку (45 чал.) газэту выпісалі толькі 9 чалавек і то з актыву (сакратар і бюро).

Прагледзеўшы ўсю тую працу, якую праводзяць гэтыя ячэйкі па падпісцы на «Чырвоную Зьмену», можна выявіць:

Ячэйкі пытаньні аб падпісцы на газэту «Чырвоная Зьмена» ставяць толькі ў дзень вялікіх «сьвятаў» (Дзень Друку і інш.)

Упаўнаважаныя па падпісцы на газэту выбіраюцца з ліку слабейшых комсамольцаў (шкляная гута) і што бюро ячэйкі не дапамагае яму ў гэтай справе.

Бываюць выпадкі, калі ўпаўнаважаны па друку «пашырае свае правамоцтвы» і зьбірае падпіску на газэты «Звезда», «Правда» і г. д. сярод працаўнікоў усяго прадпрыемства, а між тым з падпіскай на комсамольскія газэты справа абстаіць вельмі дрэнна. Ужо ўстанавілася назва на такога ўпаўнаважанага—не ўпаўнаважаны па друку, а па бруку.

Пяцітыднёвік газэты «Чырвоная Зьмена» будзе мець характар суду над газэтай.

Але адначасова з гэтым ён будзе вялікім паказальным судом над тымі ячэйкамі, якія нядбайна адносіліся да справы выпіскі газэты.

Блакітны.

Ад рэдакцыі. Гэты нумар газэты мы як падарунак паслалі адказнаму сакратару ячэйкі ЛКСМБ шкляной гуты «Пролетары».

„Я ничего не знаю“

«Я ничего не знаю»,—коратка і ясна **адпаліў мне малады бяз вусоў хлапец, які сядзіць у аддзеле падпіскі газэты «Звезда».**

Справа тут вось у чым. 7-га мая я пашоў у аддзел падпіскі газэты «Звезда», каб выпісаць на чэрвень месяц **«Чырвоную Зьмену»**. Увашоўшы ў аддзел я падышоў да вакенца, дзе сядзеў гэты малады хлапец.

— Выпішце мне, калі ласка **«Чырвоную Зьмену»** на чэрвень месяц?

Даўшы яму 25 кап. я атрымаў квіток № 36 і пашоў здаволены да хаты. І калі дома я добра паглядзеў на гэты квіток, дык убачыў што на ім напісана **замест чэрвеня май месяц.** Думаю сабе, што-ж гэта за ліха, я-ж на май сабе яшчэ ў сакавіку выпісаў і я атрымоўваю.

Падумаўшы, што гэта памылка маладога хлапца невялікая і яе можна будзе справіць я зноў вярнуўся ў аддзел падпіскі.

Падышоўшы да вакенца гэтага хлапца, кажу яму:

— Перапішыце мне калі ласка, гэты квіток з мая на чэрвень месяц, бо я-ж прасіў вас, каб выпісалі вы на чэрвень.

Але замест таго, каб выканаць маю просьбу, **малады хлапец адпаліў мне: «Я ничего не знаю». Сказаўшы гэта ён пашоў да другога стала.**

Я яшчэ пастаяў некалькі хвілін, паглядзеў на гэтага бязвусага чалавека і падумаў, ці павінна сядзець у аддзеле падпіскі такая **«шышка»**. Па маему такім казённым людзям у аддзеле падпіскі няма месца.

Алесь Адашчык.

Экскурсія—добры від турызму

З 25-ці паверхняй вышыні

Нарэшце мы ўсе ў доўгачаканым горадзе Леніна. Пасьля сьнеданьня сьпяшаемся азнаёміцца з горадам. На зморанасьць не зьвяртаем увагі, ідзем пешкам да Ісаакіеўскага сабору, каб з яго вышыні, 25-ці паверхаў, паглядзець на горад.

Узьбіраемся, наперадзе бясконца цягнуцца каменныя ўсходцы. Галава кружыцца, навокал цёмна. Сьцеражэшся аступіцца і ўсё сьпяшаешся ўперад.

Нарэшце дабраліся. Якое хараство!

Перад вачыма прыгожы горад, доўгія прамыя вуліцы з высокімі дамамі з аграмаднымі палацамі, прыгожымі помнікамі і садамі на плацох.

З аднаго боку відаць фабрычна-заводзкія трубы, з другога—Кранштат і як скінуць вокам вада. Недалёка відаць Нява, шматлікія каналы... Вецер гуляе па плячох, разьвівае валасы... Унізе відаць як дэманструюць натоўпы рабочых, вышоўшыя протэставаць супроць апошніх падзей у Англіі. І ўсе яны здаюцца такімі малюхенькімі з такой вышыні.

Хочацца адчуваць гэтую моц гораду бліжэй, прайціся па вуліцы, зьліцца з гэтай шматтысячнай грамадою рабочых...

Эфроімская і Цэйтліна.



Едзем да хаты

Вось праляцелі 11 дзён нашай экскурсіі... Апошні дзень нашага жыцьця ў дарозе.

Неяк ня думаецца і ня верыцца, што хутка ўся гэта грамада распыліцца па ўсёй нашай Беларусі і ўжо ня будзе гэтай вясёлай беларускай комсамольскай грамады, якая некалькі дзён стройнымі шэрагамі хадзіла па Ленінграду, сьпяваючы родныя сьпевы. міжвольна прымушаўшыя ленінградцаў пытацца: «адкуль гэта вы прыехалі?»

З самай раніцы з вагонаў несьліся сьпевы: пелі згрудзіўшыся ў купэ, не сядзеў кожны на сваім мейсцы.

Перад Віцебскам адзін экскурсант зьлез, зрабілі яму шумныя провады. У Віцебску таксама некалькі чалавек пакінулі колектыў. У Воршы ўжо канчаткова наш вялікі колектыў раскалоўся.

Тут ужо зрабілі невялічкі мітынг.

Да адходу цягніка пасьпявалі, з,арганізавалі скокі, ня гледзячы на протэсты станцыённай адміністрацыі.

Распрашчаліся бадзёра, з пажаданьнем будучым летам таксама зрабіць вандроўку.

Алеся Гуцько.

На барту „Парыскай Комуны“

(Уражаньні на экскурсыі моладзі)

Ноч. Экскурсанты сьпяць. Усе зморамныя, але ў кожнага ў думках—лінкор «Парыская Комуна».

Пачынае сьвітаць.

6 гадзін,

Курцік абходзіць калідоры і стукамі кулака ў дзьверы дае знаць, што пара ўставаць. У калідоры пачынаецца шум. Бягуць у перагонку заняць чаргу ля крану, каб асьвяжыцца і пасьпець да адьезду пагутарыць з маракамі. За сьнеданьнем толькі і чуеш: хутчэй, хутчэй... Нява Фінскі заліў... «Парыская Комуна» маракі...

У 7 гадзін, вясёлыя, сьпяваючы Беларускую Марсельезу, накіроўваемся к Няве, а адтуль на буксіры па Фінскаму заліву да лінкору.

Нехта захапіў з сабою гармонік і над залівам разносіцца «Лявоніха».

Вось мы ўжо бачым наш лінкор.

Пад крыкі «ура» пералазім на яго борт.

Карабель вялізарны. Навакол вада і неба. Подалек стаяць іншыя караблі—сябры нашага лінкору. На кожны з іх прыехалі госьці. Чуваць галасы прывітаньняў і музыкі. Групамі заходзім у кубрыкі. Гутаркі, сьмех, жарты, знаёмімся з іх жыцьцём. Яны нам паказваюць пабудову свайго карабля. На палубе ўжо пасьпелі з'організавацца гульні, і нават жывая газэта.

З боку прыцэліўся фотографічны апарат, каб зьняць гэтае рэдкае спатканьне.

Экскурсанты.



НА ГНІЛЫХ БАЛОТАХ ЗАКВІТНЕЮЦЬ НІВЫ

„Чортавы балоты“, „Гнілыя балоты“ моцна ўрасьлі ў беларускую зямлю

Гэтыя вялікія абшары выцягнем з гразі тады, калі ўпражэмся ў гэту працу ўсім сваім моцным колектывам

Упражэмся ўсёй масай!

Бюро ЦК УсеЛКСМ, гаворачы аб працы ЛКСМБ, тоўстай рыскай падкрэсьліў: **засабліва павінна быць вылучана задача ўдзелу ў мэліорацыі і ў рабоце па пераводу насельніцтва на тарфяны апал.**

Мэліорацыйная справа з кожным годам усё больш і больш узмацняецца. Гэтай справе Савецкая ўлада аддае вялікую ўвагу, на правядзеньне мэліорацыі адпушчаюцца вялікія сумы грошай. У Слуцкай, Мазырскай, Менскай, Аршанскай і ва ўсіх іншых акругах ужо на асушаных балотных кавалках **сапраўды квітнеюць нівы**. Многія **«гнілыя балоты»**, **«кабыльлі балоты»**, «чортавы балоты» уступілі месца працавітаму земляробу.

Зроблена шмат. Зрабіць трэба—**яшчэ больш.**

Комсамольскім организацыям, ячэйкам трэба без'адкладна падумаць над гэтым пытаньнем, вызначыць некалькі практычных мерапрыемстваў і ўзяцца за іх ажыцьцяўленьне.

Цяпер бярэцца курс на **ўзмацненьне ўвагі** самых мас працоўнага сялянства да справы мэліорацыі, да справы замены дравянога апалу тарфяным.

Тут нашым комсамольскім ячэйкам, **па прыкладу Ямніцкіх комсамольцаў** (праміраваных на Магілеўскім конкурсе), **трэба ўзмацніць сваю працу ў мэліорацыйных таварыствах.**

Мэліорацыя ў умовах БССР—**вялікая і адказная справа!**

Ні адно малейшае дасягненьне ў гэтай працы, ні адзін малейшы вопыт не павінен прайці міма ўвагі газэты «Чырвоная Зьмена». Нашым юнвяскорам трэба зорка сачыць за гэтай працай ячэек і пісаць пра яе ў газэту.

У Меншчыне 117 тысяч гэктараў балота.

Асушыўшы іх—зьнішчым беззямельле.

Пры наліччы ў БССР зямельнага голаду, вясковага расслаеньня, выхаду на пасёлкі, землебудаўніцтва сялян і надзяленьня зямлёй працоўных яўрэяў, пытаньне аб асушцы балот набывае асабліва важнае значэньне.

На долю Менскай акругі выпадае даволі значная даўжыня няспраўных вадапрыёмнікаў, прыблізна да 1330 кілёмэтраў, выпраўленьне якіх разьмяжована па часткам у працягу 5-гадовага пляну работ.

У працягу 1925-26 году, які трэба лічыць за год зруху з мёртвай кропкі меліарацыйных работ у акрузе, на дзяржаўныя сродкі праведзены наступныя работы:

Адрагулявана рака Грабэлька (Самахвалавіцкі раён) агульнай даўжынёй у 16 кілёмэтраў, што дае магчымасьць селета прыступіць да асушкі **800 гэктараў** балот раскінутых у яе басэйне, а таксама дазваляе заняцца торфараспрацоўкамі на блізка ляжачым тарфяным масыве.

Адрагулявана частка ракі Тальбі (Пухавіцкі раён) працягам каля 6 кілёмэтраў; поўная рэгуліроўка ракі Тальбі, якая разьлічана на сёлетні і наступныя гады, дасьць магчымасьць асушыць 10.000 гэктараў балот, раскінутых у яе басэйну.

63 таварыствы.

Акрамя работ дзяржаўнага значэньня за 1924-26 год, дзякуючы водпуску сродкаў, Акрвыканкомам значна разгарнуліся работы мэліорацыйных таварыстваў.

Усяго па Менскай акрузе існуе **63 таварыствы з агульным лікам членаў 3.929 чалавек**, на абшарах падлягаючых мэліорацыі ў 12.380 гэктараў.

З маючыхся 63 мэліорацыйных таварыстваў земляныя работы за мінулы год у сябе правялі згодна складзеным вучасткам, 17 таварыстваў Заслаўскага, Койданаўскага, Самахвалавіцкага і Смалявіцкага раёнаў, на абшарах 2352 гэктараў.

Але амаль палова таварыстваў да гэтага году не ахоплена была работай з прычыны няхваткі гідра-тэхнічнага пэрсаналу.

У сучасны момант першарадная задачай зямельных органаў павінна быць **пашырэньне мэліорацыйных работ, павялічэньне гідратэхнічнага пэрсаналу і г. д.**

За мінулы год культурна-тэхнічныя работы выявіліся ў заснаваньні па раёнах 17 паказальных пунктаў.

У сярэдніх ліках мая месяца пачаліся мэліорацыйныя работы ва ўсіх раёнах Менскай акругі. Па мэліорацыйным таварыствам на асушаных балотах **працуюць два трактары**—у Заслаўскім і Смалявіцкім раёнах.

Акрамя гэтага культурна-тэхнічны пэрсанал акругі заняты **закладкай паказальных вучасткаў у мэліорацыйных таварыствах**, аказаньнем тэхнічнай дапамогі па **кульцівіраваньню ўжо высушаных зямельных вучасткаў.**

Тарфяны подсьціл.

Чаму пустуе глеба?

Беларусь мае лёгкія глебы; каб атрымаць з іх добрыя ўраджаі, трэба ўносіць шмат гною. Узяць-жа яго няма дзе. Таму і глеба ў патрэбнай мэры ня ўгнойваецца: так, замест патрэбных на гэктар 2.400 пуд. кладзецца 400-800 пуд., з гэтай прычыны і ўраджаі на Беларусі бываюць вельмі малыя.

Напрыклад, сярэдні ўраджай жыта 46 пуд., аўса 52 пуд., бульбы 541 п. (ураджай 1923-24 г.). Гною-ж і г. д. бывае тым больш, чым больш подсьцілу мае скаціна; калі подсьцілу мала, то шмат угнаеньня дарэмна гіне; **у хляве робіцца гразь, у ёй па калені стаіць скаціна. У такіх умовах скаціна часта хварэе на ногі. Гнойная жыжка перапаўняе хлявы і выліваецца на двор, пападае ў калодзежы і забруджвае ваду: гэта шкодзіць здароў'ю чалавека.**

Вясковыя гаспадаркі Беларусі патрабуюць на подсьціл 101.500 тысяч пудоў саломы. Сялянамі-ж ужываецца на подсьціл толькі каля 50.000 пудоў саломы. Значыцца **недахоп саломы ў год складае больш чым 50.000 пудоў.**

Торф замест саломы.

Верхні пласт нашых тарфяных балот—ня горшы подсьціл за салому, а нават і лепшы. Трэба ўзяць рыдлёўку, парэзаць на цэгліны верхні пласт травянога, а лепш мохавага балота і затым іх высушыць на балоце альбо вывесьці к скотнаму хляву пад страху. Перад тым, як імі падсьцілаць скаціну, цэгліны трэба добра памяць. Яшчэ больш зручна селяніну запасьціся тарфяным подсьцілам з восені, на санях вывезьці пад страху, дзе і прамарозіць цэлую зіму. Летам подсьціл пад навесам зусім высахне і, разьмяўшы яго, можна ўжываць на подсьціл у хлявы. Для аднае галавы рагатае жывёлы трэба ў год 36 пудоў саломы, а для дробнае—4,6 пуд. саломы. Кожны гаспадар можа лёгка вылічыць недахоп саломы. Пуд саломы замяняецца паўпудам сухога тарфянога подсьцілу. Замяняючы саламяны подсьціл тарфяным, мы тым самым зьберажэм салому на другія патрэбы.

Чым-жа тарфяны подсьціл лепшы за салому? **Ён лёгка ўбірае смурод хлява, здаравей для ног жывёлы, а галоўнае добра ўбірае ў сябе жыжку ад гною—ў 5 разоў больш за салому.**

Пры тарфяным подсьціле хлявы заўсёды сухія, маюць чыстае паветра і гной дарэмна ня гіне. Подсьціл падсыпаецца пад ногі скаціне, пластом у 3-4 верш. (13-14 сант.). З першага часу, каб прывучыць скаціну, зьверху торф прысыпаюць саломай. Як подсьціл прамокне, сыплюць новы пласт і г. д. Тарфяны гной вывозіцца на поле разам з саламяным.

Гэтыя вопыты правераны сялянамі вёскі **Увельле** (Ушчэрскай воласьці, Клінцоўскага павету, былое Гомельскай губэрні) **нават на пескавых глебах.** Пасьля гэтых вопытаў сяляне той-жа вёскі **перашлі на тарфяны подсьціл**, а лішнюю салому пачалі прадаваць.

Кожны селянін, кожны малады гаспадар можа праверыць гэтыя вопыты і ў сваёй гаспадарцы.

А, Ум.

ГАРАС ГУШЧА

Гнілое балота

(Адрывак апавяданьня „На прастор жыцьця“)

XIX.

Недалёка ад «сьвятога калодзежу», улева ад дарогі на Загор'е, спрадвеку ляжыць гіблае месца, Гнілое Балота. Ніхто не памятае, з якіх часоў утварылася яно тут. Ні лягэнд, ні паданьняў не засталося аб ім. Яно займае вялізарную плошчу, валок на **10**. Сям-там на гэтым балоце пападаюцца невялічкія астраўкі жорсткай буйной асакі, гайкі высокіх мятлістых чаротаў. Зялёнымі шляхамі цягнецца шыроколістны аер, і голасьцябляны цыбаты сітняг зьвешваецца над смалістачорнаю гладзьдзю «чортавых вакон», аздобленых крыглымі вадзянымі лопухамі. Ні чалавек, ні жывёла ня можа ступіць на гэтыя нетры Гнілога Балота. Так і ляжыць яно, засланае прэльлю гнілых тумноў, поўнае машкары, камарэчы, разносячы заразу. За балотам пачынаюцца Сухія Груды. Няма карысьці заборцаўцам і ад гэтых грудоў, бо іх выжарвае сонца, і не расьце на іх трава. Прабавалі засяваць іх сям-там ды кінулі, бо там нічога не расло, а падвесьці гною было і трудна па разьбітай грэблі побач Гнілога Балота, і нявыгодна. Так і пуставалі, аблогам ляжалі і тое балота і тыя груды.

Аб гэтым Гнілым Балоце і аб гэтых Сухіх Грудох часта думае Сьцяпан Барута. Яны так жывы ў яго памяці, што ён памятае кожную драбніцу іх. Ведае ён, што Сухія Груды крута спускаюцца да глыбокай даліны рэчкі Міранкі. Па яго меркаваньні Гнілое Балота ляжыць вышэй жолаба рэчкі. Сама сабою напрошваецца думка—прарэзаць глыбокім каналам трудзі Сухіх Грудоў і спусьціць Гнілое Балота ў Міранку, каб на яго месцы зазеляне́ў пышны луг. Ідэя, над якой варта падумаць. Гэта была-б яго першая цадваліна пад «зруб для новага калодзежу».

Яшчэ тады, калі Сьцёпка спрачаўся з Сымонам Галызаю аб марнай траце слоў, у ім жыла гэтая ідэя. Але яна была першым і толькі адным маленькім зьвенцам у сыстэме Сьцёпкавага пляну работы на вёсцы. Гэты плян ён зьвязаў з ідэяй экономічнай культуры краіны. Чым больш думаў і разважаў Сьцёпка над сваім плянам, тым цьвярдзей умацоўваўся над канечнаю яго патрэбаю, тым большае рэальнае афармленьне прымаў ён.

Па Сьцёпкавай думцы, рост экономічнай моцы краіны толькі тады пойдзе належным ходам, калі мерапрыемствы дзяржавы ня толькі сустрэнуць поўнае падтрыманьне самога сялянства, але калі само сялянства пойдзе на дапамогу дзяржаве. А для гэтага трэба выхаваць у ім грамадзкую дысцыпліну, уласны пачын і прывычку вясьці работу колектывам. Сродкам для такога выхаваньня могуць быць саюзы, якія Сьцёпка назваў бы «колектывамі працы». Грамадзкай работы для такіх «колектываў працы» знойдзецца ў кожнай сялібе. Сьцёпка і хоча на практыцы спрабаваць ці можна выступаць з прапагандаю такіх саюзаў! С гэтымі думкамі і ехаў ён у свае Заборцы пасьля двух гадоў разлукі з імі.

Цяпер Сьцёпка быў ужо сталым юнаком. Шырокаплечы, моцны, як дуб, ён рабіў уражаньне спакойнага чалавека, упэўненага ў сваіх сілах. Шэрыя вочы яго пазіралі ўдумліва і сур'езна, а часамі насьмешліва.

Яго паяўленьне ў Заборцах было цэлаю праявою вясковага жыцьця, бо ў свaім часе ён нарабіў столькі шуму ў сяле, што аб ім доўга гаварылі і прарочылі яму нялюдзкую долю. Аказалася, што ён вярнуўся жывы і здаровы і ў вус сабе ня дзьме.

Зьвярнуўшыся ў свой двор, Сьцёпка спаткаўся з бацькам. І сын і бацька спыніліся, моўчкі паглядзелі адзін аднаму ў вочы. Сур'eзнасьць раптам зышла з твару Міхайлы Баруты, а вочы засьвяціліся радасьцю.

— Глядзеце, што за дуб! І бура ня зваліць!—І нота задавальненьня пачулася ў голасе Баруты ібацькі.

— Дармо, бацька! Досыць пад бурамі гнуцца!

І бацька і сын павіталіся за рукі.

— А нічаго сабе кормяць там вас, дальбог... Ну, маладзец, што на бацьку не зацяўся. Пойдзем-жа ў хату... Давай свой «чумадан».

Не зрабілі і двух крокаў, як з хаты выбегла маці.

— Ах, сыночак мой, Сьцёпачка!—і са сьлязьмі кінулася да сына.

— Папрабуй узяць яго на рукі,—пажартаваў Міхайла.

Усе трое ўвашлі ў хату. Зараз-жа прыбег і Юрка; Алеся ня было дома, у полі быў. Маці закідала сына пытаньнямі, плакала і сьмяялася. А Сьцёпка паважна расчыніў пакоўны чамадан і вынуў адтуль вялікую суконную хустку, гасьцінец для маткі, а потым вывалак боты на бацькаву нагу, а для братоў дастаў кусок матэрыі на кашулі, карандашы і сшыткі. Юрка зараз-жа пабег з карандашом на вуліцу пахваліцца сваім гасьцінцам і нават расьпісаўся некалькі разоў на сьценах. Падышлі сваякі і суседзі. А па Заборцах скора пашла гутарка, што Сьцёпка «навалок» да дому дабра.

Пад вечар таго самага дню пашоў Сьцёпка за сяло.

—- Куды-ж ты, сынок, пойдзеш?—запытала маці.

Прайдуся пад «сьвяты калодзеж».

— Хаця-ж ты, сынок, не чапай яго,—затрывожылася маці.

— Не, —махнуў рукою Сьцёпка:—Зусім ня тое ў мяне на ўме.

А потым, запыніўшыся, сказаў да бацькі.

— Ведаеш, тата, што я тут хачу рабіць?

— Ну?

— Думаю папрабаваць спусьціць Гнілое Балота ў Міранку.

Паглядзеў Міхайла на сына, і твар яго неяк зьмяніўся.

— Вось гэтая, брат, думка была і ў мяне, дальбог!

Памаўчаў.

— Уся справа ў тым, каб знайсьці рукі,--сказаў ён,--ну, і трэба галава, каб магла пакіраваць гэтаю справаю.

-- Эгэ,--весела азваўся сын:--калі такая думка была ў цябе, то яна напэўна была і ў другіх галовах.

-- Ты што-ж хочаш сказаць, што мая галава горшая за другія?

-- Не, я толькі хачу сказаць, што Гнілое Балота ня будзе балотам.

-- Ну, але-ж гэта трохі цяжэй, ніж раскідаць «сьвяты калодзеж».

Сьцёпка вышаў, а Міхайла стаў на дварэ, пазіраў усьлед сыну і штось разважаў, а потым ён кіўнуў сам сабе галавой. Ёсьць у хлопца галава. Бач ты, што за мыслі... Ну, ну... славу сабе набыў-бы. Цікава, кудою думае канал павясьці?

Праходзячы каля «сьвятога калодзежа» Сьцёпка запыніўся. Новы крыж і зруб пасьпелі ўжо пасівець за гэты час. Сьцёпку прыпомнілася тая ноч, калі ён з хлапцамі разбурвалі гэты калодзеж. Разбурыць трэба самую ідэю, а зруб і крыж--гэта што?»--падумаў Сьцёпка і пайшоў далей. Мінут праз 10 ён стаяў над Гнілым Балотам і прагным поглядам азіраў яго топографію, яго зялёныя шаты аераў, чаротаў, сітняку і пышных купін.

З аднаго боку над балотам цягнуўся вал досыць правільным паўкругам. На гэтым вале, пахіліўшыся над балотам, стаяў старэнькі, старэнькі дуб, тоўсты і нізкі з сухім верхам. «Ці ня было тут калі возера», думаў Сьцёпка. Другім сваім паўкругам Гнілое Балота ўпіралася ў Сухія Груды. Груды былі значна ніжэй прылежнага вала. Так, ён не памыліўся: на вока заметна, што балота ляжыць вышэй даліны Міранкі. Спусьціўся ў даліну, пастаяў, штось мяркуючы, а потым павярнуў назад да Гнілога Балота, лічучы крокі. Тысяча восемсот крокаў, трохі болей вярсты.

Гэты агляд зусім задаволіў Сьцёпку,—можна сьмела прыступаць да работы. Як добры знак, улічваў Сьцёпка і тое, што сказаў яму бацька.

«Ну, балота, пабарукаемся з табою, патрывожым твой спакой!»

Ужо зьмяркалася, калі Сьцёпка падыходзіў да заборцаў. А на вуліцы бабка Агата казала суседцы Таклюсі:

— Каля «сьвятога калодзежа» стаяў і пазіраў. А потым спаваў паміж рэчкаю і Гнілым Балотам—бабка Агата гаварыла гэта таямнічым голасам.

— На душы ў яго неспакойна!—аўтарытэтна адказала Таклюся—«Сьвяты калодзеж» у яго з памяці ня выходзіць.

І тут-жа перадала адно здарэньне са студэнтам, які зьнімаў срэбра з божай маткі. Увесь час потым божая матка ў вачох яму стаяла. І што-ж? Розуму тронуўся!.. Гэта-ж ім ня жарты!».

(Працяг будзе ў чарговым нумары).

Рэспубліка заўтра.

Саўнаркомам зацьверджан дзяржаўны бюджэт.

Рацыяналізацыя Савецкага апарату дасьць магчымасьць узмацніць гаспадарчае будаўніцтва.—38 мільёнаў рублёў на электрыфікацыю.—Пабудова новых фабрык і заводаў.

Гэтымі днямі на пасяджэньні Саўнаркому БССР разглядаўся распрацаваны наркаматам грашовых спраў **праэкт аб асновах пабудовы дзяржаўнага бюджэту БССР на 1927-28 г.**

Саўнарком, выходзячы з неабходнасьці здавальненьня неадкладных патрэб рэспублікі ў галіне прамысловасьці і сельскай гаспадаркі, прызнаў, што **рост выдатковай часткі бюджэту ня можа быць пастаўлены ў залежнасьць толькі ад росту прыбыткаў дзяржавы.**

Выдатковая частка дзяржаўнага бюджэту БССР павінна быць пабудавана на **прынцыпе строгай эканоміі і максымальнага скарачэньня выдаткаў на ўтрыманьне дзяржаўнага апарату.**

Уся эканомія ад скарачэньня адміністрацыйных выдаткаў, штатаў, ліквідацыі лішніх устаноў будзе накіравана галоўным чынам на **здавальненьне вытворчых патрэб рэспублікі.**

Усе даходы па бюджэту не пакрываюць выдаткаў, якія перавышаюць даходы ў суме 6.668 тысяч рублёў. Для пакрыцьця гэтага дэфіцыту, Саўнарком узьнімае хадайніцтва перад саюзным урадам аб асыгнаваньнях з агульна-саюзнага фонду.

У адносінах выдаткаў па задавальненьню социяльна-культурных патрэб, прызнана неабходным забясьпечыць натуральны рост і паступовае якаснае палепшаньне існуючых устаноў і мерапрыемстваў.

У адносінах заработнай платы прызнана неабходным захаваць устаноўленыя па дзяржаўнаму бюджэту стаўкі, адначасова падцягваючы заробак найбольш адсталых груп работнікаў.

* * *

Савет Народных Камісараў заслухаў даклад дзяржпляну аб 5-гадовым пэрспэктыўным пляне **разьвіцьця народнай гаспадаркі БССР.**

Шырока абмеркаваўшы даклад дзяржпляну Саўнарком вызначыў агульны плян разьвіцьця народнае гаспадаркі БССР у наступным выглядзе: у галіне сельскай гаспадаркі генэральнай лініяй павінна быць **інтэнсіфікацыя яе, павялічэньне валавой продукцыі, беручы курс на разьвіцьцё** тых культур, якія пастаўляюць сыравіну для нашай прамысловасьці.

Пытаньні электрафікацыі займаюць у пляне значнае месца. Мяркуюцца ўзмацнёныя будаўніцтвы электрычных установак, прычым іх энэргію, уключаючы і Асінастрой, мяркуецца павялічыць **больш чым у 5 разоў.** Усяго на электрабудаўніцтва будзе асыгнавана за гэтыя 5 гадоў каля **38 мільён. руб.**

Па прамысловаму будаўніцтву мы будзем мець даволі значны рост. Вызначана **пабудова цэлага шэрагу фабрык і заводаў**—тэкстыльных, хэмічных, харчавых, папяровых, скураных і г. д.

Для выкананьня праграмы капітальнага будаўніцтва і разгортваньня прамысловасьці, мяркуецца расходваць за гэтыя 5 год **звыш 50 мільёнаў руб.**

Такім чынам у сучасны момант ужо вызначаны больш менш дакладна тыя шляхі, па якіх будзе разьвівацца народная гаспадарка БССР у працягу 5-ці бліжэйшых гадоў.

Не застацца за цірам!

Усебеларускі стралковы конкурс

З 15 чэрвеня па 1-е верасьня «**Чырвоная Зьмена**» сумесна з Цэнтральным Саветам ТСААвіяхіму праводзіць **Усебеларускі стралковы конкурс.**

Мэта конкурсу—популярызаваць працу стралковых гурткоў, уцягнуць у яго новыя тысячы комсамольцаў.

У конкурсе маюць права ўдзельнічаць **толькі стралковыя гурткі** пры грамадзкіх організацыях. Індывідуальных запісаў ня будзе. **Да конкурсу не дапусьцяць** таксама стралкоў, атрымаўшых прызы на ранейшых спаборніцтвах. **Такім чынам конкурс разьлічан на шырокія масы нашай моладзі.**

Запіс гурткоў на конкурс будзе праведзен **да 15 чэрвеня.** З 15-га чэрвеня да 1-га жніўня гурткі трэніруюцца. З 1-га жніўня пачынаюцца спаборніцтвы адначасова па ўсёй Беларусі. Вынікі спаборніцтваў пасылаюцца ў Цэнтральную Судзейскую Камісію і яна будзе прысуджаць прызы завочна па прысланых сьпісах.

Ацэнка гурткоў будзе давацца ня толькі па колькасьці выбітых ачкоў. **Будзе прымацца пад увагу і процант уцягненьня моладзі заводу ці іншага прадпрыемства ў стралковую справу.** Сыграе ролю і колькасьць вылучаных удзельнікаў у адносінах да агульнай колькасьці сяброў гуртка.

ТСААвіяхіму прадстаўляе гурткам і акруговым організацыям усё магчымае для правядзеньня конкурсу: вінтоўкі, ціры, патроны і г. д.

Запіс на конкурс праводзіцца Цэнтральным Саветам ТСААвіяхіму.

Ніводзін стралковы гурток не павінен застацца за цірам стралковых спаборніцтваў!

Комсамольскія організацыі павінны прыняць усе меры да таго, каб конкурс прашоў добра.

У бліжэйшых нумарох «**Чырвонай Зьмены**» **будуць надрукаваны** падрабязныя матар'ялы аб конкурсу.

Крывое люстра

„А шчасьце было так блізка“...

Доўга думала тав. Цукерман—павад піонэрскага атраду пры саюзе Нарпіт—над тым, як-бы сабраць грошы на такія „роскашы“ як мяч і новыя гальштукі... Атрад атрымоўваў ад саюзу па 3 рублі ў месяц і гэтыя грошы хутка разыходзіліся па розныя дробязі. А на мяч і гальштукі трэ' было мець ня менш чым рублёў 12-15. Як тут быць?

Урэшце Цукерман знашла выхад:

— Ня буду браць у саюзе 4 месяцы грошы—і зьбяру патрэбную суму!.. Бось дзе добра, калі раптам новы мяч і гальштукі ў атрадзе зьявяцца!...

Пацяклі дні. Крыху цяжка было без штомесячнай пэнсіі, але затое ўхмылялася будучына.

Усе піонэры ўжо знаді аб тым, што зьбіраюцца сродкі на мяч і гальштучкі і з нецярпеньнем чакалі таго моманту, калі грошы можна будзе атрымаць.

Надышоў май—доўгачаканы месяц.

Цукерман сьмела адчыніла дзьверы саюзу і зьвярнулася да сакратара:

Я прышла атрымаць грошы для атраду... Нам належыць за 4 месяцы...

Сакратар зьдзіўлена паглядзеў на дзяўчыну і холадна прагаварыў:

— Я не разумею... Вы-ж ня прыходзілі сюды за грашмі—ну, мы і запрыходавалі...Я нічога ня ведаю—раз вы прасрочылі, значыць зараз нічога не атрымаеце...

Дарэмна Цукерман растлумачвала сакратару, што грошы зьбіраліся для адпаведнай мэты, што ўвесь атрад ведае аб гэтым, што яны маюць права на гэтыя 12 руб.

Сакратар быў цьвёрд і нічога не хацеў слухаць. Цукерман сумна апусьціла галаву і пашла да хаты: „А шчасьце было так блізка...“

І.

Да 11 ліпеня

Да дню вызваленьня Беларусі ад белапалякаў, цэнтральны савет АСА Авіяхіму прыстасоўвае **2-дзёньнік, прысьвечаны абароне краіны.**

У час 2-дзеньніка на мясцох будуць наладжвацца вайсковыя выстаўкі, масавыя выступленьні гурткоў ТСО Авіяхіму, дэмонстрацыі, папулярныя лекцыі і г. д.

„Наша Беларусь“

Распачаліся здым... кіно-фільмы „**Наша Беларусь**“, якая павінна адбіць гаспадарчыя і культурныя дасягненьні нашай краіны да 10-й гадавіны Кастрычнікавай рэволюцыі.

Ужо засняты некаторыя характэрныя моманты з жыцьця беларускай прамысловасьці (фабрыкі і заводы ў Гомелі).



„Дзень радыё“

12-га чэрвеня г. г. на Беларусі будзе праводзіцца **„Дзень радыё“**

Мэта дню—шырока популярызаваць радыё-справу сярод рабочых і сялян, выявіць і падагуліць посьпехі і дасягненьні радыёфікацыі БССР.

У тры радкі

○ Зборнік, прысьвечаны 7-й гадавіне вызваленьня Беларусі ад белапалякаў, выпушчае да 11 ліпеня Выдавецтва „Чырвоная Зьмена“.

○ Згодна пастановы ВСФКБ з 15-га па 25 жніўня будзе праводзіцца **ўсебеларускае сьвята фізкультуры.**

○ 5-га чэрвеня адчыніўся **ўсебеларускі зьезд упаўнаважаных сельска-гаспадарчай коопэрацыі**

○ У БССР існуюць **48 нацыянальных сельсаветаў**, якія абслугоўваюць 62 тысячы чалавек насельніцтва розных нацменшасьцяў.

○ Сёлета ў Менску організуецца **дом адпачынку для юных піонэраў**, на што Менакругком Чырвонага Крыжу адпусьціў 1.000 руб.

○ ЦК дапамогі дзецям наладжвае ў хуткім часе **двохмесячнік па барацьбе з беспрытульнасьцю дзяцей.**


○ Выканбюро пролетстуду БДУ організавала **10 турысцкіх студэнцкіх груп**, якія маюць на мэце правесьці экскурсіі ў розныя мясцовасьці СССР.

○ Беларускі пэдагагічны тэхнікум выпушчае сёлета **45 настаўнікаў.**

○ 1-га чэрвеня **закончыліся заняткі ў малодшых групах** сямігодак і вясковых 4-х гадовых школах.

○ **Конкурс на лепшы ў БССР камітэт сялянскай узаемадапамогі** будзе праводзіцца з 10-га чэрвеня па 10 ліпеня.

ПАДДАЦЬ ПАРУ!



1 чэрвеня праехалі, а да 10 процантаў яшчэ далёка!

Чытаў? Выпісаў?

Вышла з друку і знаходзіцца ў прадажы ўва ўсіх кнігарнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва кніга:

Б. Олікер і Л. Розенблюм

„Нарысы па гісторыі Комсамолу Беларусі“

Старонак—296. Цана—1 р. 25 к.

На фінальным туры

3-га чэрвеня закончыўся першы тур фінальнага турніру працоўнай моладзі. У выніку: **Лапідус** выграў у **Кацнельсона. Гаві**—у Штэйна, **Кэйліс**—у Будоля, **Лейкін**—у **Майзэльса, Ліўшыц**—у **Лабад[illegible]кага.**

Другі тур адбудзецца 6-га [illegible]веня.

Да ведама шахма[illegible]стых

Наступныя ўдзельнікі [illegible]вага турніру павінны да 15-га чэрвеня згуляць матчы для высьвятленьня першынства ў групах: **Эпштэйн з Левіным, Шэвельман з Кісіным. Ліхачоў з Ліўшыцам.** Запіс матчаў трэба перадаваць у турнірны камітэт тав. **Ліпкінду.**

Прызы будуць раздадзены на ўрачыстым адчыненьні масавага шахтурніру моладзі.

Што на шляху зьніжэньня?

Бясспрэчна, што некаторыя гандлёвыя організацыі паставілі перад сабой усур'ёз **задачу зьніжэньня цэн** і робяць усё магчымае ў гэтым напрамку. Другія-ж (большасьць) ніяк ня могуць зварушыцца з месца і застаюцца пры цэнах, якія існавалі ў іх месяц таму назад. Інтэнсыўна зьніжаць ім цяжка, бо гэта зьвязана са скарачэньнем апаратаў, гандлёвых выдаткаў і інш. «неабходных рэчаў».

Той, хто наведае шэраг менскіх крам розных гандлёвых органаў, адразу адчувае, што і тут, у самым цэнтры, пад самым бокам Наркамгандлю са зьніжэньнем цэн ня ўсё нармальна і, відавочна, парушаюцца гранічныя накідкі. Гэта парушэньне выяўляецца перш усяго ў разнабоі паміж цэнамі на адны і тыя-ж тавары ў розных коопэратывах.

Зьвернемся да лічбаў—прэйскурантных цэн.

Назва тавару	МЦРК	ТПО МББч	Чыр. Крыж	«Общий Труд»	Бел. Ларок.
Кілё рысу . .	38 к.	36 к.	56 к.	57 к.	54 к.
Кілё грэцкіх круп .	18½ к.	18 к.	20 к.	19½ к.	20 к.
Кавалак ядравага мылу	24 к.	22 к.	—	22 к.	18½ к.
» мрамар. мыла	16 к.	18 к.	16 к.	18 к.	18½ к.
Кілё падашвы .	3 р. 75 к.	3 р. 40 к.			3 р. 90 к

Зробім яшчэ некалькі заўваг.

Выкрыта, што прыказчыкі некаторых магазынаў, напрыклад, „Общій Труд», **самавольна павышалі цэны на шмат якія тавары.**

У магазыне «Чырвонага Крыжу» няма прэйскуранту. Загадчык магазыну называе на пэўны тавар адну цану, а прыказчык другую. Шмат тавараў знаходзіцца ў брудным, сырым памяшканьні і ад гэтага псуецца.

Цэрабкоп зьнізіў цэны на дарагія няходкія тканi, лякіраваныя туфлі ды інш. У той час як на звычайны, больш патрэбны шырокім масам матар'ял, як палатно, цэны амаль што не зьмяніліся.

«Продасілікат» пашоў далей. Ён зьнізіў цэны толькі на самыя дарагія шкляныя вырабы, як сэрвізы і абажуры з узорамі з розпакаляровага шкла, але зусім ня зьнізіў цэн на звычайную ходкую пасуду, як шклянкі, лямпавае шкло і г. д.

Таксама ўстаноўлена, **што ўсё гэтыя** гандлёвыя організацыі, **калі і робяць** нешта ў галіне **зьніжэньня цэн, дык** толькі за рахунак **скарачэньня прыбыткаў**, але не за лік **зьмяншэньня накладных выдаткаў.**

З.

Сонца, калёны і белы горад.

Комсамолія Менску на адчыненьні лягераў.

Раніцою, гадзін у восем, групкамі зьбіраліся ячэйкі. Ажывіўся горад, забурліў, загаварыў тысячамі маладых галасоў.

З усіх куткоў гораду,—з Ляхаўскіх скурзаводаў, з Серабранкі, з Камароўкі, з вакзалаў Заходняй і МББ чыгунак, маленькімі раўчакамі цяклі ячэйкі, накіроўваючыся да сваіх райкомаў. Ля райкомаў раўчакі зьліваліся ў адзін бурлівы паток... Сьпяшаць, бо ведаюць загад: **якая першай прыдзе к райкому, тая ідзе на чале ўсей калёны.**

Песьні лёгкай дымкай падымаліся ў вышыню... Песьні розныя... **У кожнай ячэйцы свае песьні.**

Было **10 гадзін**, калі раённыя калёны крануліся да пляцу Волі.

Першай на пляц прышла Ляхаўка.

Раённыя організацыі зьліліся... І праз некалькі хвілін даўжэзная калёна ўсёй Менскай гарадзкой комсамольскай організацыі кіпучай лавай сьцякала ўніз к Ляхаўцы... **да лягэраў.**

Сонца пякло. Хлопцы скідвалі верхняе адзеньне, даючы магчымасьць сонечным праменьням аблізваць цела.

— Вунь ужо віднеюцца палаткі лягерныя—крыкнуў нехта—**Ура!... Крыкі** радасьці прапесьліся па шэрагах... **Пайшлі** хутчэй.

Яшчэ сотня крокаў—і мы ў лягерах.

Парад войск. Акрамя прадстаўнікоў Чырвонай арміі, яго прымалі яшчэ т. т. Кнорын, Галадзед, Бараньнікаў прадстаўнікі ЦВК і Менскага Гарсавету.

Пасьля параду—маленькі мітынг... Выступалі з прывітаньнямі т. т. Кнорын, Галадзед і інш. Выступаючыя ў сваіх выступленьнях адзначалі вялікую ролю Чырвонай арміі, неабходнасьць яе ўзмацненьня асабліва ў сучасных міжнародных абставінах.

— Ні скрэжат зубоўны капіталістых, сказаў гэнэральны сакратар ЦК КП(б)Б тав. Кнорын,— ні іх узмацнёныя ваенныя ўзброеньні ня спужаюць нас! Мы пляны будаўніцтва нашай гаспадаркі ні на іоту не скарацім! На імкненьне буржуазіі выклікаць нас на вайну, мы адкажам яшчэ большым узмацненьнем будаўніцтва соцыялізму ў нашай краіне!

Разгарнуліся спортгульні.

Асаблівае захапленьне ўсіх прысутных выклікалі дрэсіраваныя коні, якія танцавалі пад гукі оркестру.

У ціры гурткі АСААвіахэму па чарзе паказваюць свае мастацтвы. Шмат спрытных добрых стралкоў.

Ужо вечарэла, калі моладзь зварочвалася назад у горад. Хлынуўшы дождж не папсаваў баявога настрою!

Р. Гольдзін.

„Ларок“—наперадзе

«Беларускі Ларок» на фронце зьніжэньня цэн—адзін з перадавых байцоў. У некаторых адносінах ён нават абагнаў такія важныя коопэратыўныя організацыі, як МЦРК, МСІКО і інш.

Магазыны «Беларускага Ларка» знаходзяцца на акраінах гораду і адрозьніваюцца тым, што ня маюць хвастоў. У магазынах зазвычай усяго адзін прыказчык і ён ўпаўне спраўляецца са сваёй працай.

Дзякуючы рацыяналізацыі апарату упарадачэньні гандлёвай справы, «Беларускі Ларок» у агульным зьнізіў цэны больш чым на 8 проц.

Калі параўнаць цэны цяперашнія і цэны на першае студзеня г. г. дык мы знойдзем тавары, цэны на якія зьніжаны больш чым на 10 проц. Так па алей цэны зьніжаны на 11,7 проц., на булкі французскія на—14 проц., на ніткі — на 15 проц. і г. д.

Паміж іншым «**Ларку**» удалося зьнізіць на 10 проц. цэны на **цукар-рафінад**, што не зрабіла ніводная коопэрацыйная організацыя.

Ня гледзячы на шпаркае зьніжэньне цэн, зварот «Ларка» расьце з кожным месяцам.

А. Каліта.

Згублены.

Сяброўскія білеты Бягуна П. № 42475 Гебелева Д. № 8349, Гебелева С 38885 Каплана Ф. № 2037, Левіна І. № 42473 Малаціенка С. № 8353, Осыпчыка Н. 8350 Русінова А. № 38890, Разенгауза Б. 42773 Русінова Г. № 251, Марголіна Н. № 1308 Рунца А. № 1339, Навасельскага А. № 1338 Рудзінскай Т. № 1520, Сьвірыда Н. № 35248 Нечая Г. № 24959, Екельчыка І. № 1527

Лічыць страціўшымі моц.

Адказныя рэдактары { А. БАРАНЬНІКАЎ. А. КУРЦІК.

Галоўлітбел № 24867 Менск, 2 друкарня БДВ.